**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Прарэктар па вучэбнай рабоце

_______________ А. В. Данільчанка

"___" __________ 2016 г

Рэгістрацыйны № УД-2465/вуч.

**Літаратура бліжняга замежжа**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці ( па напрамках)**

**1-21-05-02 Руская філалогія**

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-21 05 02–2013 і вучэбных планаў УВА D21-068/уч. 2013 г., D21-069/уч. 2013 г., D21-067/уч. 2013 г., D21-066/уч. 2013 г. дзённая форма навучання; D21з-089/уч. 2013 г., D21з-093/уч. 2013 г., D21з-094/уч. 2013 г., D21з-095/уч. 2013 г. – завочная форма навучання па спецыяльнасці 21 05 02 ("Руская філалогія")

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Дзюкава Э.Ю.**, дацэнт кафедры славянскіх літаратур, кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Рагойша В.П, загадчык кафедры тэорыі літаратуры, доктар філалагічных навук, прафесар

Вострыкава Е.У., дацэнт кафедры славянскіх літаратур, кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай славянскіх літаратур (пратакол № 9 ад 29 мая 2016 г.);
Навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта (пратакол № 6 ад 09.06.2016 г.)

**УЗГОДНЕНА**

Загадчык кафедры
славянскіх літаратур
доктар філалагічных навук, прафесар І. А. Чарота

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Прарэктар па вучэбнай рабоце

________________ А. В. Данільчанка

“___”_______________201_____

Рэгістрацыйны № УД-_______/вуч.

# Літаратура бліжняга замежжа

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці ( па напрамках)**

**(дзённая форма навучання):**
**1-21-05-02 Руская філалогія**

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-21 05 02–2013 і вучэбных планаў УВА D21-068/уч. 2013 г., D21-069/уч. 2013 г., D21-067/уч. 2013 г., D21-066/уч. 2013 г. дзённая форма навучання; D21з-089/уч. 2013 г., D21з-093/уч. 2013 г., D21з-094/уч. 2013 г., D21з-095/уч. 2013 г. – завочная форма навучання па спецыяльнасці 21 05 02 ("Руская філалогія")

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Дзюкава Э.Ю.**, дацэнт кафедры славянскіх літаратур, кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Рагойша В.П, загадчык кафедры тэорыі літаратуры, доктар філалагічных навук, прафесар

Вострыкава Е.У., дацэнт кафедры славянскіх літаратур, кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай славянскіх літаратур (пратакол № 9 ад 29 мая 2016 г.);
Навукова-метадычным саветам філалагічнага факультэта (пратакол № 6 ад 09.06.2016 г.)

**УЗГОДНЕНА**

Загадчык кафедры
славянскіх літаратур
доктар філалагічных навук, прафесар І. А. Чарота

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Літаратура бліжняга замежжа” разлічана на студэнтаў спецыяльнасці: -21 05 02 (“Руская філалогія”) філалагічнага факультэта БДУ і адрасаваны тым, хто вывучае літаратуру бліжняга замежжа.

**Мэта** прапанаванай дысцыпліны – даць агульнае ўяўленне пра асноўныя асаблівасці і з’явы літаратурнага працэсу ў літаратурах краін бліжняга замежжа (польскай і ўкраінскай): з пачатку прыгожага пісьменства да сучаснасці ў кантэксце агульнага развіцця культуры, гісторыі, грамадскага жыцця народаў. Ставіцца **задача** развіць літаратуразнаўчы досвед студэнтаў, азнаёміць іх з лепшымі ўзорамі і дасягненнямі польскай і ўкраінскай літаратур з улікам іх ідэйнай, мастацкай і эстэтычнай каштоўнасці, разнастайнасці ў тэматыцы, жанравых формах і мастацка-выяўленчых асаблівасцях. Спосаб падачы вучэбнага матэрыяла прадугледжвае характарыстыку літаратурных тэндэнцый і твораў у шырокім культурным, гістарычным і літаратурным кантэксце. Пазначаюцца вектары магчымага параўнальнага аналізу з беларускай, рускай, іншаславянскімі і еўрапейскімі літаратурамі.

Дысцыпліна ўваходзіць у **комплекс УВА цыкла спецыяльных дысцыплін**.

У выніку праходжання дысцыпліны “Літаратура бліжняга замежжа” **студэнты павінны ведаць:**

- асноўныя перыяды развіцця польскай і ўкраінскай літаратуры,
- нацыянальную спецыфіку літаратур бліжняга замежжа,
- галоўныя кірункі і літаратурныя плыні ў гісторыі польскай і ўкраінскай літаратуры,
- лепшых прадстаўнікоў нацыянальных літаратур Польшчы і Украіны,
- творчую адметнасць самых слынных аўтараў.

**ўмець:**

- аналізаваць мастацкі твор;
- знаходзіць блізкія альбо кантрастныя па змесце і форме літаратурныя з’явы;
- распазнаваць адметнасці мастацкіх кірункаў і стыляў;
- вызначаць мастацкі метад;
- параўноўваць літаратурныя з’явы і мастацкія творы з улікам іх ідэйнай, эстэтычнай вартасці, разнастайнасці тэматыкі, жанравых форм, вобразна-выяўленчых сродкаў і стылёвых асаблівасцей.

**валодаць:**

- навыкамі аналіза і параўнання мастацкіх твораў;
- сістэмай літаратуразнаўчых тэрмінаў і паняццяў, якія дазваляюць характэрызаваць ідэйныя і эстэтычныя вартасці, жанравыя формы, мастацкія асаблівасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Літаратура бліжняга замежжа” фарміруюцца наступныя **кампетэнцыі**:

**АК-1.** Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

**АК-3.** Валодаць даследчымі навыкамі.

**АК-4.** Умець працаваць самастойна.

**АК-7.** Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прыстасаванняў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп’ютарам.

**АК-8.** Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

**САК-1.** Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

**САК-2.** Быць здольным да сацыяльных кантактаў.

**ПК-1.** Планаваць. арганізоўваць і весці педагагічную (вучэбную, метадычную, выхаваўчую) дзейнасць.

**ПК-2.** Выкарыстоўваць розныя тэхналогіі навучання мове і літаратуры.

**ПК-5.** Планаваць. арганізоўваць і весці навукова-даследчую працу ў галіне філалогіі.

**ПК-7.** Выкарыстоўваць у працы сучасныя камп’ютарныя метады збору, апрацоўкі і захавання інфармацыі.

**ПК-8.** Прадстаўляць вынікі навуковай працы ў адпаведнасці з патрабаваннямі.

**ПК-9.** Выкарыстоўваць сучасную методыку рэферавання і рэдагавання тэкстаў.

**ПК-10.** Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах.

## Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

На вывучэнне дысцыпліны “Літаратура бюліжняга замежжа” дзённай формы навучання адводзіцца **124 гадзіны** на спецыяльнасці “Руская філалогія”. З іх **50** гадзін аўдыторных заняткаў: **34** гадзіны лекцыйных і **10** гадзін практычных заняткаў, **6** – кср – для дзеннай формы навучання; для завочнай – **14** гадзін аўдыторных заняткаў, з іх **10** – лекцыйных, **2** – практычных, **2** – кср; для завочнай скарочанай – **12** гадзін аўдыторных, з іх **8** – лекцыйных, **2** – практычных, **2** – кср

Дысцыпліна вывучаецца студэнтамі філалагічнага факультэта на **3 курсе дзеннай формы навучання, 5-6 курсах – завочнай формы навучання**

Форма выніковай атэстацыі – **экзамен у 5 сяместры ( дзённая форма)**; **залік у 9 сяместры (завочная)**

Адпаведны спіс літаратуры дае магчымасць студэнтам самастойна вывучаць пэўныя тэмы, розныя інтэрпрэтацыі твораў у літаратурнай крытыцы, схіляе да творчага падыходу ў разглядзе таго ці іншага матэрыялу.

# ЗМЕТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. УВОДЗІНЫ

Змест дысцыпліны. Непасрэдныя або апасродкаваныя ўплывы творчасці пісьменнікаў блізкага замежжа. Прапедэўтыка (уводзіны ў гісторыю ўкраінскай і польскай літаратур). Гісторыя ўкраінскай і польскай літаратуры як галіна літаратуразнаўства.

## Тэма 2. РАЗВІЦЦЁ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР Ў ЭПОХУ СЯРЭДНЯВЕЧЧА.

Развіцце рэлігійнай літаратуры, ўзнікненне светскай літаратуры. Жанравая спецыфіка.

**Асаблівасці развіцця польскай літаратуры** ў эпоху сярэднявечча. Жанравыя і мастацкія асаблівасці першых помнікаў літаратуры.Помнікі літаратуры на лацінскай мове. Хронікі Гала Ананіма і Вінценты Кадлубека. Асноўныя рэлігійныя і культурныя цэнтры. Адкрыццё і роля Кракаўскага ўніверсітэта (1364).

**Праблема перыядызацыі ўкраінскай літаратуры**, прынцыпы і крэтэрыі – гісторыка-сацыяльны, гісторыка-культурны, эстэтычны. Асноўныя асаблівасці літаратурнага працэсу ў гістарычным аспекце, суаднесенасць з культурна-цывілізацыйным развіццём Еўропы. Зараджэнне ўласна украінскай літаратуры (XII – XIII стст.), яе вытокі і шляхі развіцця. Летапісанне, творы рэлігійных жанраў, узнікненне свецкай літаратуры, перакладныя творы.

## Тэма 3. РОСКВІТ СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР Ў ЭПОХУ РЭНЕСАНСУ І БАРОКА. ЭПОХА АСВЕТНІЦТВА.

**Польская літаратура** эпохі Ренесансу. Развіццё навукі і культуры. Літаратура першых польскіх гуманыстаў. Я. Дантышак, К. Яніцкі, А. Кшыцкі, М. Рэй. Я. Каханоўскі — першы славянскі паэт эпохі Рэнесансу. Яго сучаснікі і паслядоўнікі. Палемічная літаратура ў Польшчы, яе буйнейшыя прадстаўнікі (А.Ф. Маджеўскі, Ажахоўскі); асаблівасці праблематыкі. Барока ў полькай літаратуры. Сарматызм: асаблівасці з’явы; буйнейшыя прадстаўнікі.

**Украінская літаратура рэнесансу**. Традыцыі Рэнесансу і Барока ў творчасці І. Велічкоўскага, Л. Барановіча і інш. Школьная вершатворчасць, царкоўна-рэлігійныя вершы Л. Барановіча, І. Максімовіча, К. Зіноўева, творчасць «вандроўных дзякоў». Школьная драма, лялечны тэатр.

Палемічная літаратура (2-я пал. XVI – XVII стст.), яе буйнейшыя прадстаўнікі (Г. Сматрыцкі, З. Капысценскі, Х. Філалет і інш.). Актуальнасць тэматыкі, палемічная завостранасць трактатаў і пасланняў І. Вышанскага, адметнасць стылю.

Казацкія летапісы як помнік вызваленчай вайны 1648 – 1654 гг. Летапісы Самавідца, Г. Грабянкі і С. Вялічкі. Літаратура XVIII ст. Ідэі *Асветніцтва,* **украінскае Барока**. Асветніцкая і літаратурная дзейнасць

Р. Скаварады. Цыкл «*Байки Харківські*» (1774) – пачатак жанру байкі ва ўкраінскай літаратуры. Зборнік вершаў «*Сад божественних пісень*».

**Новая ўкраінская літаратура (канец XVIII – XIX стст.)** Выяўленне ў ёй нацыянальнай спецыфікі, паглыбленне дэмакратызму, ідэйна-тэматычнае ўзбагачэнне і жанрава-стылёвая разнастайнасць. Творчасць І. П. Катлярэўскага (1769 – 1838).

**Тэма 4. РАЗВІЦЦЁ ТРАДЫЦЫЙ РАМАНТЫЗМУ Ў СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУРАХ**. Шляхі развіцця еўрапейскага рамантызму. Рамантызм у славянскай літаратурнай парадыгме.

**Асаблівасці полькага рамантызму.** “Украінская” і “беларуская” “школы” польскага рамантызму. Фальклор у эстэтычнай парадыгме польскіх рамантыкаў. А. Міцкевіч — буйнейшы прадстаўнік польскага рамантызма. Вызначальная роля яго зборніка “Poezja” (1822). Нацыянальна-гістарычныя адметнасці польскага рамантызму 30-40-х гг. XIX ст. Паэзія Юльюша Славацкага.

**Украінскі рамантызм** 20-60 гг. Асноўныя напрамкі, асяроддзе, буйнейшыя прадстаўнікі. Фальклярызм, народна-песенная аснова паэзіі Л. Баравікоўскага, А. Мятлінскага, А. Афанасьева-Чужбінскага, М. Пятрэнкі, багацце яе жанрава-стылёвай палітры (балада, лірычная песня, раманс, элегія, санет і інш.)

Т. Р. Шаўчэнка (1814 – 1861) як буйнейшы прадстаўнік рамантызму і заснавальнік рэалізму ва ўкраінскай літаратуры. Зборнік «Кабзар» (1840). Спалучэнне рамантызму, сентыменталізму і рэалізму ў творах паэта. Палітычная сатыра («Сон», «Каўказ», пасланне «І мёртвым, і жывым…»). Цыкл «У каземаце» (1847), захаляўныя кніжкі («Нявольніцкая муза»), Кос-Аральскі цыкл. Проза Т. Шаўчэнкі. Творчасць пасля ссылкі. Т. Шаўчэнка і Беларусь. Рамантычныя тэндэнцыі ў творчасці Т. Шаўчэнкі.

**Тэма 5. РАЗВІЦЦЁ СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР У 2-Й ПАЛОВЕ XIX - ПАЧ. XX ст. АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ПОЛЬСКАЙ І УКРАІНСКАЙ ЛІТАРАТУР.**

**Польскі пазітывізм.** А. Свентахоўскі (1849-1938). Барацьба “старых” і “маладых”. “Тэндэнцыйны” раман у польскай літаратуры гэтага перыяду. Асноўныя мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі польскай паэзіі ў 60-80-ыя гг. Развіццё драматургіі ў польскай літаратуры 60-80-х гг. **Перыяд класічнага рэалізму** ў польскай літаратуры, абнаўленне арсеналу мастацкіх сродкаў.

Мастацкія асаблівасці творчасці Б. Пруса (1845-1912). Уплыў пазітывізму на яго творчасць. Ідэйна-тэматычная і мастацкая эвалюцыя пісьменніка ў апавяданнях 70-80-ых гг. Адлюстраванне польскай вёскі ў аповесці “Фарпост” (1885). Раман “Фараон” (1895) і яго праблематыка.

Генрык Сянкевіч (1846-1916). Майстэрства Сянкевіча-навеліста. Гістарычная проза пісьменніка. “Трылогія” Г.Сянкевіча (раманы “Агнём і мячом”(1884), “Патоп” (1886), “Пан Валадыёўскі”(1888)).

Творчасць Э. Ажэшкі. “Маладая Польшча”, буйнейшыя прадстаўнікі, асаблівасці праблематыкі і стылю.

Развіццё паэзіі ў 60-80-ыя гг. Адам Аснык (1838-1897) і асноўныя матывы яго лірыкі. Жанравая разнастайнасць, майстэрства вершаванай формы. Творчая індывідуальнасць Ф.Фаленьскага

**Мадэрнісцкая плынь** “Młoda Polska”: трактоўка тэрміна, ідэйна-эстэтычная барацьба, унутраная перыядызацыя. Тэарэтыкі і прапагандысты “Маладой Польшчы”: Зенон Пшэсмыцкі (Мірыям)(1861-1944), А.Грушэцкі і інш.

Стэфан Жэромскі (1864-1925) як прадстаўнік рэалізму перыяду “Маладой Польшчы”, яго уплыў на польскую прозу 20 ст. Уладзіслаў Рэймант (1867-1925) як пісьменнік-рэаліст на пераломе стагоддзяў. **Натуралістычныя тэндэнцыі** ў польскай літаратуры перыяду пазітывізму. Творчасць Адольфа Дыгасіньскага (1839-1902).

Развіццё паэзіі ў канцы 19 пач.20ст. Панаванне мадэрнісцкіх плыней. Імпрэсіяністычныя тэндэнцыі ў паэзіі Казімежа Тэтмайера, сімвалізм у паэзіі Яна Каспровіча (зб.“Гімны”), Баляслава Лесьмяна, ідэйна-мастацкія пошукі Тадэвуша Міціньскага (зб. “У змроку зорак”).

Польская драматургія на пераломе стагоддзяў. Станіслаў Выспяньскі (1869-1907). Лірыка Выспяньскага.

**Украінская літаратура паслярэформеннай эпохі**. **Паглыбленне рэалізму** і дэмакратычных тэндэнцый у творчасці М. Ваўчок, Ю. Фядзьковіча, Л. Глебава, С. Руданскага, А. Свідніцкага; пашырэнне жанрава-стылёвых магчымасцей украінскай паэзіі і прозы. П. Куліш (1819–1897) як пісьменнік, этнограф, культурны дзеяч.

Творчасць І. Нячуй-Лявіцкага (1838–1918) і Панаса Мірнага (1849–1920) – новы этап у развіцці **крытычнага рэалізму** ва ўкраінскай літаратуры.

Украінскі тэатр і драматургія апошняй чвэрці XIX ст. Творчая спадчына М. Крапіўніцкага (1840–1910), М. Старыцкага (1840–1907), І. Карпенкі-Карага (1846–1907) – важнейшае дасягненне ўкраінскай драматургіі канца XIX ст. Характар драматычнага канфлікту, паглыбленне псіхалагізму у п'есах.

І. Франко (1856–1916). Актуальнасць і сацыяльная завостранасць лірыкі паэта (вершы «Гімн», «На судзе», «Міласэрным», «Беркут», «Каменяломы», цыклы «Думы пралетарыя», «Санеты»). Ідэйна-тэматычнае багацце і жанрава-стылёвая палітра зборнікаў «Завялае лісце» (1896), «Мой Ізмарагд» (1898), « З дзён журбы» (1900), «Semper tiro» (1906). Паэмы І. Франко. Паэма «Майсей» (1905) – другі «запавет» украінскай літаратуры. Проза пісьменніка, драматургія («Украдзенае шчасце» (1893).

Навелістыка М. Кацюбінскага – вышэйшае дасягненне ўкраінскай малой прозы пачатку XX ст. **Рысы імпрэсіянізму** ў псіхалагічных навелах «Квецень яблыні» (1902), «Невядомы» (1907), «Intermezzo» (1908), аповесці «Цені забытых продкаў» (1911), раскрыццё «пачуццяў рэчаіснасці», патоку свядомасці, адчуванняў і ўражанняў чалавека ў творах.

Жыццё і творчасць Лесі Украінкі. Багацце тэм, матываў, вастрыня і актуальнасць праблематыкі, вытанчанасць паэтычнай формы лірыкі ў

зборніках «На крылах песень» (1893), «Думы і мары» (1899), «Водгукі» (1902). Драма-феерыя «Лясная песня» (1911). Асаблівасці жанра. Багацце і непаўторнасць мастацкай палітры «Лясной песні».

В. Стэфанік – неперауўзыйдзены майстар псіхалагічнай навелы («Камены крыж», «Навіна» «Кляновыя лісткі», і інш.).

## Тэма 6. ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС НА ЗЕМЛЯХ ПОЛЬШЧЫ І УКРАІНЫ Ў 1-Й ПАЛ. XX СТ.

**Літаратурны рух на Украіне ў 20–30 гады.** Палітыка *«украінізацыі»,* масавы прыход у літаратуру маладых сіл. Утварэнне літаратурных аб'яднанняў паводле ідэйна-эстэтычных прынцыпаў *(«Плуг», «Гарт», «ВУСПП», «Маладняк», «ВАПЛіте», «Марс»* і інш.).

П. Тычына (1891–1967). Зборнік «Сонечныя кларнеты» (1918). Ідэал гармоніі чалавека, прыроды, сусвету ў вершах. асаблівасці паэтыкі. Музычнасць, дасканаласць рытмічнага малюнка, пераемнасць лепшых дасягненняў сусветнага сімвалізму ў зборніку. Эвалюцыя светапогляду.

М. Рыльскі (1895–1964). Этапы творчага шляху паэта. Зварот да гуманістычных традыцый сусветнай літаратуры ў ранні перыяд творчасці (зб. «На белых астравах», «Сіняя далячынь», «Пад асеннімі зоркамі»). Ідэйна-эстэтычныя пошукі паэта ў 20-я гады («Трынаццатая вясна», «Праз буру і снег», «Дзе сыходзяцца дарогі»), актыўная работа над перакладамі класічнай спадчыны сусветнай літаратуры (А. Міцкевіча, А. Пушкіна). Творчы ўзлёт паэта ў 1950–60-я гады.

Ідэйна-стылёвыя пошукі М. Хвылёвага, асэнсаванне жыцця і свядомасці людзей у навелістыцы (зб. «Сінія эцюды», 1924). Элементы рамантызму і імпрэсіянізму ў навелах «Я (Рамантыка)», «Кот у ботах», «Салонскі Яр», «Легенда», «Арабескі» і інш.

Адлюстраванне складаных працэсаў класавай барацьбы ў вёсцы перыяду станаўлення савецкай улады ў рамане А. Галаўко «Бур'ян» (1927). Камедыі М. Куліша «Народны Малахій» і «Міна Мазайла» – узор сатырычнага майстэрства драматурга. Маральна-этычны, псіхалагічны канфлікт у грамадстве ў перыяд грамадзянскай вайны як асноўная тэма «Патэтычнай санаты».

**Польская літаратура міжваеннага дваццацігоддзя (1918-1939).** Творчасць С.Жэромскага пасля 1918 г. Раман “Напрадвесні” (1925), праблема месца і ролі нацыянальнай інтэлігенцыі ў ім. Рэалізм твораў Зоф'і Налкоўскай (1884-1954), іх ідэйна-мастацкая адметнасць (“Раман Тэрэзы Генерт” 1924), “Мяжа” (1935) і інш.). Развіццё паэзіі, паэтычныя суполкі і іх прадстаўнікі (“Скамандар”, “Квадрыга”, “Кракаўская Авангарда”, “Жагары”, фармізм і інш). Творчасць прадстаўнікоў старэйшага пакалення (Леапольд Стаф). Інтымная і пейзажная лірыка Марыі Паўліковай-Яснажэўскай 1894-1945) Баляслаў Лесьмян (1878-1937). Сімвалізм і экспрэсіянізм, сюррэалізм лірыкі паэта. Гратэскна-сатырычная вобразнасць яго твораў. Паэтыка зборнікаў 20-30-ых гадоў. Авангардысцкія плыні ў польскай паэзіі і прозе 20-30-ых гг.

**Тэма 7. ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС НА ЗЕМЛЯХ ПОЛЬШЧЫ І УКРАІНЫ Ў 2-Й ПАЛ. XX– ПАЧ. XXI СТ. АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ЎКРАІНСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУР У СУЧАСНЫ ПЕРЫЯД.**

Асноўныя накірункі ў развіцці польская літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст. Развіцце прозы, драматургіі. Паэзія 2-й пал. XX ст. В. Шымборска, Э. Ліпска, Ю. Баран, Л. Мачульскі і інш. Багацце формы і зместу ў сучаснай польскай літаратуры.

Асноўныя тэндэнцыі ў савецкай украінскай літаратуры перыяду сталінскіх рэпрэсій. Творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў. Шляхі развіцця ўкраінскай літаратуры другой паловы XX стагоддзя. Адраджэнне гуманістычных традыцый украінскай літаратуры ў перыяд «хрушчоўскай адлігі». Асноўныя цяжкасці развіцця украінскай літаратуры , асаблівасці тэматыкі і стылю.(А. Ганчар, М. Стэльмах, Л. Кастэнка).

Асуджэнне вайны і выкрыццё палітыкі недаверу ўлады да чалавека ў рамане А. Ганчара «Чалавек і зброя» (1960). Антываенны пафас і маральна-этычная праблематыка ў рамане «Тронка» (1963). Выкрыццё супярэчнасцей у сферы духоўнасці і маралі, папярэджанне аб наступе «ціхіх водаў застою» ў рамане «Сабор» (1968). Вастрыня і надзённасць узнятых праблем, сімволіка мастацкіх вобразаў у творы.

Творчасць Л. Кастэнкі (зб. «Промні зямлі», 1957, «Вандроўка сэрца», 1961). Гістарычны раман у вершах «Маруся Чурай» (1979) як вяршыннае дасягненне Л. Кастэнкі і адна з выдатнейшых з'яў ва украінскай літаратуры.

Украінская літаратура канца XX – пачатку XXI стагоддзяў: агульныя тэндэнцыі, наватарства, імёны. Мастацкія здабыткі ўкраінскай літаратуры ў агульнаеўрапейскім і сусветным кантэксце.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА 1 (дзённая форма)

| Нумар раздела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў, літаратура | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **Тэма 1. Уводзіны.**<br>1.Узаемаўплывы творчасці пісьменнікаў блізкага замежжа.<br>2. Прапедэўтыка (уводзіны ў гісторыю ўкраінскай і польскай літаратур).<br>3. Гісторыя ўкраінскай і польскай літаратуры як галіна літаратуразнаўства. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя [18-20,22,23, 36, 41] | | Вуснае апытанне |
| 2. | **Тэма 2. Развіццё ўсходнеславянскіх літаратур ў эпоху сярэднявечча.**<br>1.Развіццё рэлігійнай літаратуры, ўзнікненне светскай літаратуры. Жанравая спецыфіка.<br>2. Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў эпоху сярэднявечча. Жанравыя і мастацкія асаблівасці першых помнікаў літаратуры<br>3. Праблема перыядызацыі ўкраінскай літаратуры, прынцыпы і крэтэрыі – гісторыка-сацыяльны, гісторыка-культурны, эстэтычны. Зараджэнне ўласна украінскай літаратуры (XII – XIII стст.), яе вытокі і | 4 | 2 | | | Курс лекцый, хрэстаматыя [9,18-20,22,23, 28, 29, 37, 37, 41] | | Пісьмовы тэст, рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | шляхі развіцця. | | | | | | | |
| | **Тэма 3. Росквіт славянскіх літаратур ў эпоху Рэнесансу і Барока. Эпоха Асветніцтва.**<br>1.Польская літаратура эпохі Ренесансу. Развіццё навукі і культуры. Літаратура першых польскіх гуманыстаў.<br>2. Я. Каханоўскі — першы славянскі паэт эпохі Рэнесансу.<br>3. Барока ў польскай літаратуры. Сутнасць сарматызму.<br>4. Украінская літаратура рэнесансу.<br>5. Традыцыі Рэнесансу і Барока ў творчасці І. Велічкоўскага, Л. Барановіча і інш.<br>6. Школьная драма, лялечны тэатр.Палемічная літаратура (2-я пал. XVI – XVII стст.), яе буйнейшыя прадстаўнікі.<br>7. Жыццё і творчасць Г. Скаварады<br>8. Новая ўкраінская літаратура (канец XVIII – XIX стст.) Творчасць І. П. Катлярэўскага (1769 – 1838). | 6 | 2 | | | Курс лекцый, Хрэстаматыя [18 – 20, 22, 25, 26, 28, 335, 37, 41] | 2 | Пісьмовы тэст |
| | **Тэма 4. Развіццё традыцый рамантызму ў славянскіх літаратурах.**<br>1.Шляхі развіцця еўрапейскага рамантызму. Рамантызм у славянскай літаратурнай парадыгме.<br>2. Асаблівасці полькага рамантызму.<br>3. А. Міцкевіч — буйнейшы прадстаўнік польскага рамантызму. Вызначальная роля яго зборніка “Poezja” (1822).<br>4. Нацыянальна-гістарычныя адметнасці польскага рамантызму 30-40-х гг. XIX ст. Паэзія Юльюша Славацкага.<br>5. Украінскі рамантызм 20-60 гг. Асноўныя напрамкі, асяроддзе, буйнейшыя прадстаўнікі.<br>6. Т. Р. Шаўчэнка (1814 – 1861) як буйнейшы прадстаўнік рамантызму і заснавальнік рэалізму ва ўкраінскай літаратуры. | 10 | 2 | | | Курс лекцый Хрэстаматыя, мастацкія альбомы, зборнікі паэзіі [1, 3, 12, 18-22, 25, 26, 28, 30, 33, 37, 38, 41] | | Рэфераты, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Тэма 5. Развіццё славянскіх літаратур у 2-й палове XIX - пач. XX ст.**<br>1.Асаблівасці развіцця польскай і украінскай літаратур.<br>2. Польскі пазітывізм. Барацьба “старых” і “маладых”. Натуралістычныя тэндэнцыі ў польскай літаратуры перыяду пазітывізму. Буйнейшыя прадстаўнікі.<br>3. Перыяд класічнага рэалізму ў польскай літаратуры.<br>4. Мадэрнісцкая плынь “Młoda Polska”.<br>5. Развіццё паэзіі ў канцы 19 -пач.20ст. Панаванне мадэрнісцкіх плыней.<br>6. Польская драматургія на пераломе стагоддзяў.<br>7. Украінская літаратура паслярэформеннай эпохі. Паглыбленне рэалізму і дэмакратычных тэндэнцый<br>8. Украінскі тэатр і драматургія апошняй чвэрці XIX ст..<br>9. Мадэрнізм ва ўкраінскай літаратуры. | 6 | 2 | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, зборнікі твораў [13, 14, 17-23, 24, 26, 27, 37, 38, 41] | | Вуснае апытанне |
| | **Тэма 6. Літаратурны працэс на землях Польшчы і Украіны ў 1-й пал. XX ст.**<br>1.Літаратурны рух на Украіне ў 20–30 гады. Палітыка *«украінізацыі»,* масавы прыход у літаратуру маладых сіл.<br>2. Ідэйна-стылёвыя пошукі М. Хвылёвага.<br>3. Адлюстраванне складаных працэсаў класавай барацьбы ў вёсцы перыяду станаўлення савецкай улады ў рамане А. Галаўко «Бур'ян» (1927). Камедыі М. Куліша «Народны Малахій» і «Міна Мазайла».<br>4. П. Тычына (1891–1967). М. Рыльскі (1895–1964). Зварот да гуманістычных традыцый сусветнай літаратуры, элементы рамантызму і імпрэсіянізму.<br>5. Польская літаратура міжваеннага двадцацігоддзя (1918-1939).<br>6. Творчасць С.Жэромскага пасля 1918 г.<br>7. Рэалізм твораў Зоф'і Налкоўскай (1884-1954), іх ідэйна-мастацкая адметнасць. | 4 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, мастацкія альбомы [2, 4, 10, 15, 16, 18-22, 23, 26-28, 32, 34, 37, 39, 40,41] | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 8. Развіццё паэзіі, паэтычныя суполкі і іх прадстаўнікі.<br>9. Авангардысцкія плыні ў польскай паэзіі і прозе 20-30-ых гг. | | | | | | | |
| | **Тэма 7 Літаратурны працэс на землях Польшчы і Украіны ў 2-й пал. XX ст. – пач. XXI ст.**<br>1.Асноўныя накірункі ў развіцці польская літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст.<br>2. Развіцце прозы, драматургіі.<br>3. Паэзія 2-й пал. XX ст. В. Шымборска, Э. Ліпска, Ю. Баран, Л. Мачульскі і інш.<br>4. Багацце формы і зместу ў сучаснай польскай літаратуры.<br>5. Асноўныя тэндэнцыі ў савецкай украінскай літаратуры перыяду сталінскіх рэпрэсій.<br>6. Творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў.<br>7. А. Ганчар, М. Стэльмах, Л. Кастэнка. Вастрыня і надзённасць узнятых праблем, сімволіка мастацкіх вобразаў у творах.-<br>8.Асноўныя тэндэнцыі развіцця ўкраінскай і польскай літаратур у сучасны перыяд. | 2 | 2 | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, мастацкія альбомы [4, 5-8, 11, 18-22, 25, 26, 28, 32, 39,40] | 4 | Кантрольная праца, рэфераты |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА 2 (завочная форма)

| Нумар раздела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў, літаратура | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **Тэма 1. Уводзіны.**<br>1.Узаемаўплывы творчасці пісьменнікаў блізкага замежжа.<br>2. Прапедэўтыка (уводзіны ў гісторыю ўкраінскай і польскай літаратур).<br>3. Гісторыя ўкраінскай і польскай літаратуры як галіна літаратуразнаўства. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя [18-20,22,23, 36, 41] | | Вуснае апытанне |
| 2. | **Тэма 2. Развіццё ўсходнеславянскіх літаратур ў эпоху сярэднявечча.**<br>1.Развіццё рэлігійнай літаратуры, ўзнікненне светскай літаратуры. Жанравая спецыфіка.<br>2. Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў эпоху сярэднявечча. Жанравыя і мастацкія асаблівасці першых помнікаў літаратуры<br>3. Праблема перыядызацыі ўкраінскай літаратуры, прынцыпы і крэтэрыі – гісторыка-сацыяльны, гісторыка-культурны, эстэтычны. Зараджэнне ўласна украінскай літаратуры (XII – XIII стст.), яе вытокі і | | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя [9,18-20,22,23, 28, 29, 37, 37, 41] | | Пісьмовы тэст, рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | шляхі развіцця. | | | | | | | |
| | **Тэма 3. Росквіт славянскіх літаратур ў эпоху Рэнесансу і Барока. Эпоха Асветніцтва.**<br>1.Польская літаратура эпохі Ренесансу. Развіццё навукі і культуры. Літаратура першых польскіх гуманыстаў.<br>2. Я. Каханоўскі — першы славянскі паэт эпохі Рэнесансу.<br>3. Барока ў польскай літаратуры. Сутнасць сарматызму.<br>4. Украінская літаратура рэнесансу.<br>5. Традыцыі Рэнесансу і Барока ў творчасці І. Велічкоўскага, Л. Барановіча і інш.<br>6. Школьная драма, лялечны тэатр.Палемічная літаратура (2-я пал. XVI – XVII стст.), яе буйнейшыя прадстаўнікі.<br>7. Жыццё і творчасць Г. Скаварады<br>8. Новая ўкраінская літаратура (канец XVIII – XIX стст.) Творчасць І. П. Катлярэўскага (1769 – 1838). | | 2 | | | Курс лекцый, Хрэстаматыя [18 – 20, 22, 25, 26, 28, 335, 37, 41] | | Пісьмовы тэст |
| | **Тэма 4. Развіццё традыцый рамантызму ў славянскіх літаратурах.**<br>1.Шляхі развіцця еўрапейскага рамантызму. Рамантызм у славянскай літаратурнай парадыгме.<br>2. Асаблівасці полькага рамантызму.<br>3. А. Міцкевіч — буйнейшы прадстаўнік польскага рамантызму. Вызначальная роля яго зборніка “Poezja” (1822).<br>4. Нацыянальна-гістарычныя адметнасці польскага рамантызму 30-40-х гг. XIX ст. Паэзія Юльюша Славацкага.<br>5. Украінскі рамантызм 20-60 гг. Асноўныя напрамкі, асяроддзе, буйнейшыя прадстаўнікі.<br>6. Т. Р. Шаўчэнка (1814 – 1861) як буйнейшы прадстаўнік рамантызму і заснавальнік рэалізму ва ўкраінскай літаратуры. | 2 | | | | Курс лекцый Хрэстаматыя, мастацкія альбомы, зборнікі паэзіі [1, 3, 12, 18-22, 25, 26, 28, 30, 33, 37, 38, 41] | | Рэфераты, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Тэма 5. Развіццё славянскіх літаратур у 2-й палове XIX - пач. XX ст.**<br>1.Асаблівасці развіцця польскай і украінскай літаратур.<br>2. Польскі пазітывізм. Барацьба “старых” і “маладых”. Натуралістычныя тэндэнцыі ў польскай літаратуры перыяду пазітывізму. Буйнейшыя прадстаўнікі.<br>3. Перыяд класічнага рэалізму ў польскай літаратуры.<br>4. Мадэрнісцкая плынь “Młoda Polska”.<br>5. Развіццё паэзіі ў канцы 19 -пач.20ст. Панаванне мадэрнісцкіх плыней.<br>6. Польская драматургія на пераломе стагоддзяў.<br>7. Украінская літаратура паслярэформеннай эпохі. Паглыбленне рэалізму і дэмакратычных тэндэнцый<br>8. Украінскі тэатр і драматургія апошняй чвэрці XIX ст..<br>9. Мадэрнізм ва ўкраінскай літаратуры. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, зборнікі твораў [13, 14, 17-23, 24, 26, 27, 37, 38, 41] | | Вуснае апытанне |
| | **Тэма 6. Літаратурны працэс на землях Польшчы і Украіны ў 1-й пал. XX ст.**<br>1.Літаратурны рух на Украіне ў 20–30 гады. Палітыка *«украінізацыі»,* масавы прыход у літаратуру маладых сіл.<br>2. Ідэйна-стылёвыя пошукі М. Хвылёвага.<br>3. Адлюстраванне складаных працэсаў класавай барацьбы ў вёсцы перыяду станаўлення савецкай улады ў рамане А. Галаўко «Бур'ян» (1927). Камедыі М. Куліша «Народны Малахій» і «Міна Мазайла».<br>4. П. Тычына (1891–1967). М. Рыльскі (1895–1964). Зварот да гуманістычных традыцый сусветнай літаратуры, элементы рамантызму і імпрэсіянізму.<br>5. Польская літаратура міжваеннага двадцацігоддзя (1918-1939).<br>6. Творчасць С.Жэромскага пасля 1918 г.<br>7. Рэалізм твораў Зоф'і Налкоўскай (1884-1954), іх ідэйна-мастацкая адметнасць. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, мастацкія альбомы [2, 4, 10, 15, 16, 18-22, 23, 26-28, 32, 34, 37, 39, 40,41] | | Рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 8. Развіццё паэзіі, паэтычныя суполкі і іх прадстаўнікі.<br>9. Авангардысцкія плыні ў польскай паэзіі і прозе 20-30-ых гг. | | | | | | | |
| | **Тэма 7 Літаратурны працэс на землях Польшчы і Украіны ў 2-й пал. ХХ ст. – пач. ХХІ ст.**<br>1.Асноўныя накірункі ў развіцці польская літаратуры другой паловы ХХ – пачатку ХХІ ст.<br>2. Развіцце прозы, драматургіі.<br>3. Паэзія 2-й пал. ХХ ст. В. Шымборска, Э. Ліпска, Ю. Баран, Л. Мачульскі і інш.<br>4. Багацце формы і зместу ў сучаснай польскай літаратуры.<br>5. Асноўныя тэндэнцыі ў савецкай украінскай літаратуры перыяду сталінскіх рэпрэсій.<br>6. Творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў.<br>7. А. Ганчар, М. Стэльмах, Л. Кастэнка. Вастрыня і надзённасць узнятых праблем, сімволіка мастацкіх вобразаў у творах.-<br>8.Асноўныя тэндэнцыі развіцця ўкраінскай і польскай літаратур у сучасны перыяд. | | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, мастацкія альбомы [4, 5-8, 11, 18-22, 25, 26, 28, 32, 39,40] | 2 | Кантрольная праца, рэфераты |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА 3 (завочная скарочаная форма)

| Нумар раздела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў, літаратура | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **Тэма 1. Уводзіны.**<br>1.Узаемаўплывы творчасці пісьменнікаў блізкага замежжа.<br>2. Прапедэўтыка (уводзіны ў гісторыю ўкраінскай і польскай літаратур).<br>3. Гісторыя ўкраінскай і польскай літаратуры як галіна літаратуразнаўства. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя [18-20,22,23, 36, 41] | | Вуснае апытанне |
| 2. | **Тэма 2. Развіццё ўсходнеславянскіх літаратур ў эпоху сярэднявечча.**<br>1.Развіццё рэлігійнай літаратуры, ўзнікненне светскай літаратуры. Жанравая спецыфіка.<br>2. Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў эпоху сярэднявечча. Жанравыя і мастацкія асаблівасці першых помнікаў літаратуры<br>3. Праблема перыядызацыі ўкраінскай літаратуры, прынцыпы і крэтэрыі – гісторыка-сацыяльны, гісторыка-культурны, эстэтычны. Зараджэнне ўласна украінскай літаратуры (XII – XIII стст.), яе вытокі і | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя [9,18-20,22,23, 28, 29, 37, 37, 41] | | Пісьмовы тэст, рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | шляхі развіцця. | | | | | | | |
| | **Тэма 3. Росквіт славянскіх літаратур ў эпоху Рэнесансу і Барока. Эпоха Асветніцтва.**<br>1.Польская літаратура эпохі Ренесансу. Развіццё навукі і культуры. Літаратура першых польскіх гуманыстаў.<br>2. Я. Каханоўскі — першы славянскі паэт эпохі Рэнесансу.<br>3. Барока ў польскай літаратуры. Сутнасць сарматызму.<br>4. Украінская літаратура рэнесансу.<br>5. Традыцыі Рэнесансу і Барока ў творчасці І. Велічкоўскага, Л. Барановіча і інш.<br>6. Школьная драма, лялечны тэатр.Палемічная літаратура (2-я пал. XVI – XVII стст.), яе буйнейшыя прадстаўнікі.<br>7. Жыццё і творчасць Г. Скаварады<br>8. Новая ўкраінская літаратура (канец XVIII – XIX стст.) Творчасць І. П. Катлярэўскага (1769 – 1838). | | 2 | | | Курс лекцый, Хрэстаматыя [18 – 20, 22, 25, 26, 28, 335, 37, 41] | | Пісьмовы тэст |
| | **Тэма 4. Развіццё традыцый рамантызму ў славянскіх літаратурах.**<br>1.Шляхі развіцця еўрапейскага рамантызму. Рамантызм у славянскай літаратурнай парадыгме.<br>2. Асаблівасці полькага рамантызму.<br>3. А. Міцкевіч — буйнейшы прадстаўнік польскага рамантызму. Вызначальная роля яго зборніка “Poezja” (1822).<br>4. Нацыянальна-гістарычныя адметнасці польскага рамантызму 30-40-х гг. XIX ст. Паэзія Юльюша Славацкага.<br>5. Украінскі рамантызм 20-60 гг. Асноўныя напрамкі, асяроддзе, буйнейшыя прадстаўнікі.<br>6. Т. Р. Шаўчэнка (1814 – 1861) як буйнейшы прадстаўнік рамантызму і заснавальнік рэалізму ва ўкраінскай літаратуры. | 2 | | | | Курс лекцый Хрэстаматыя, мастацкія альбомы, зборнікі паэзіі [1, 3, 12, 18-22, 25, 26, 28, 30, 33, 37, 38, 41] | | Рэфераты, вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Тэма 5. Развіццё славянскіх літаратур у 2-й палове XIX - пач. XX ст.**<br>1.Асаблівасці развіцця польскай і украінскай літаратур.<br>2. Польскі пазітывізм. Барацьба “старых” і “маладых”. Натуралістычныя тэндэнцыі ў польскай літаратуры перыяду пазітывізму. Буйнейшыя прадстаўнікі.<br>3. Перыяд класічнага рэалізму ў польскай літаратуры.<br>4. Мадэрнісцкая плынь “Młoda Polska”.<br>5. Развіццё паэзіі ў канцы 19 -пач.20ст. Панаванне мадэрнісцкіх плыней.<br>6. Польская драматургія на пераломе стагоддзяў.<br>7. Украінская літаратура паслярэформеннай эпохі. Паглыбленне рэалізму і дэмакратычных тэндэнцый<br>8. Украінскі тэатр і драматургія апошняй чвэрці XIX ст..<br>9. Мадэрнізм ва ўкраінскай літаратуры. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, зборнікі твораў [13, 14, 17-23, 24, 26, 27, 37, 38, 41] | | Вуснае апытанне |
| | **Тэма 6. Літаратурны працэс на землях Польшчы і Украіны ў 1-й пал. XX ст.**<br>1.Літаратурны рух на Украіне ў 20–30 гады. Палітыка *«украінізацыі»,* масавы прыход у літаратуру маладых сіл.<br>2. Ідэйна-стылёвыя пошукі М. Хвылёвага.<br>3. Адлюстраванне складаных працэсаў класавай барацьбы ў вёсцы перыяду станаўлення савецкай улады ў рамане А. Галаўко «Бур'ян» (1927). Камедыі М. Куліша «Народны Малахій» і «Міна Мазайла».<br>4. П. Тычына (1891–1967). М. Рыльскі (1895–1964). Зварот да гуманістычных традыцый сусветнай літаратуры, элементы рамантызму і імпрэсіянізму.<br>5. Польская літаратура міжваеннага двадцацігоддзя (1918-1939).<br>6. Творчасць С.Жэромскага пасля 1918 г.<br>7. Рэалізм твораў Зоф'і Налкоўскай (1884-1954), іх ідэйна-мастацкая адметнасць. | 2 | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, мастацкія альбомы [2, 4, 10, 15, 16, 18-22, 23, 26-28, 32, 34, 37, 39, 40,41] | | Рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 8. Развіццё паэзіі, паэтычныя суполкі і іх прадстаўнікі.<br>9. Авангардысцкія плыні ў польскай паэзіі і прозе 20-30-ых гг. | | | | | | | |
| | **Тэма 7 Літаратурны працэс на землях Польшчы і Украіны ў 2-й пал. XX ст. – пач. XXI ст.**<br>1.Асноўныя накірункі ў развіцці польская літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст.<br>2. Развіцце прозы, драматургіі.<br>3. Паэзія 2-й пал. XX ст. В. Шымборска, Э. Ліпска, Ю. Баран, Л. Мачульскі і інш.<br>4. Багацце формы і зместу ў сучаснай польскай літаратуры.<br>5. Асноўныя тэндэнцыі ў савецкай украінскай літаратуры перыяду сталінскіх рэпрэсій.<br>6. Творчасць пісьменнікаў-эмігрантаў.<br>7. А. Ганчар, М. Стэльмах, Л. Кастэнка. Вастрыня і надзённасць узнятых праблем, сімволіка мастацкіх вобразаў у творах.-<br>8.Асноўныя тэндэнцыі развіцця ўкраінскай і польскай літаратур у сучасны перыяд. | | | | | Курс лекцый, хрэстаматыя, мастацкія альбомы [4, 5-8, 11, 18-22, 25, 26, 28, 32, 39,40] | 2 | Кантрольная праца, рэфераты |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ВУЧЭБНАЯ ЛІТАРАТУРА


1. Адам Міцкевіч і Беларусь. – Мн., 1998.
2. Бернадська Н.І. Українська література ХХ століття. - Київ, 2008.
3. Богомолова Н.А. Польская романтическая драма. – М., 1996.
4. Польские и русские поэты ХХ века. – М., 1987.
5. Ведина В.П. Современная польская проза. - Киев, 1979.
6. Ведина В.П. Польская военная проза. - Киев, 1980.
7. Ведина В.П. Послевоенная польская проза. - Киев, 1991.
8. Вервес Г.Д. Ярослав Ивашкевич. – М., 1985.
9. Висоцький С.О. Київська писємна школа X - XII ст. - Львів-Київ-Нью-Йорк, 1998.
10. Витт В.В. Стефан Жеромский. – М., 1961.
11. Выка К. Статьи и портреты. – М., 1982.
12. Горский И.К. Адам Мицкевич, - М., 1955.
13. Горский И.К. Польский исторический роман и проблема историзма. – М., 1963.
14. Горский И.К. Исторический роман Сенкевича. – М., 1966.
15. Мусиенко С.Ф. Творчество Зофьи Налковской. – Гродно, 2003.
16. Мусиенко С.Ф. Реалистический роман в польской литературе межвоенного двадцатилетия (20-30-е гг. ХХ в.). – Мн., 1989.
17. Липатов А,В. Формирование польского романа и европейская литература. – М., 1977.
18. История литератур западных и южных славян: В 3-х т. - М., 1994-2001.
19. История польской литературы: В 2-х т. - М., 1968-1969.
20. История украинской литературы. - М., 1970.
21. Історія українськой літератури XIX ст.: У 3-х кн. - К., 1994-1998.
22. Кабржыцкая Т.В., Хмяльніцкі М.М., Дзюкава Э.Ю. Гісторыя ўкраінскай літаратуры. Украінска-беларуска-польскія літаратурныя дыялогі: вучэб. дапам.: у 2 ч. / Э.Ю. Дюкова, Т. В. Кабржыцкая, М. М. Хмяльніцкі. – Ч. 1. - Мн.: БДУ, - 2012.
23. Кабржыцкая Т.В., Хмяльніцкі М.М., Дзюкава Э.Ю. Гісторыя ўкраінскай літаратуры. Украінска-беларуска-польскія літаратурныя дыялогі: вучэб. дапам.: у 2 ч./ Э.Ю. Дюкова, Т. В. Кабржыцкая, М. М. Хмяльніцкі. – Ч. 2. - Мн.: БДУ, - 2014.
24. Литература славянских и балканских народов конца XIX - начала XX вв. Реализм и другие течения. - Мн., 1976.
25. Мархель, У. Прадвесце: Беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. / У. Мархель. – Мінск, 1991.
26. Мае браты, мае суседзі. – Мн., 2008.
27. Моренець, В. Національні шляхи поетичного модерну першої половини ХХ ст..: Україна і Польща / В. Моренець. – Київ, 2002.

28. Оболевич В.Б. История польской литературы. - Л. 1960.
29. Пелешенко Ю. Українська література пізнього середньовіччя (друга половина XIII - XV ст.). - Київ, 2004.
30. Польская поэзия. В двух томах. Сост.: Живов М., Стахеев Б. - М., 1963.
31. Польская поэзия: XX век. Антология. - М., 1993.
32. Польская поэзия: XX век. Антология. - М., 1995.
33. Польский романтизм и восточно-славянские литературы. – М., 1973.
34. Розстріляне Відродження. Шедеври української репресованої драматургії. – Донецьк: ТОВ «ВКФ»БАО», 2009. – 416 с.
35. Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. / Укладанне, прадмова, каментарыі А. Бразгунова. – Мінск, 2011.
36. Современное зарубежное литературоведение. Энциклопедический справочник. - М., 1996.
37. Украінская літаратура. Хрэстаматыя. У пяці частках. Аўт.-склад.: Т.В. Кабржыцкая, П.І. Навойчык, У.В. Рагойша. Ч.1, 2, 3. - Мн., 2004, 2005, 2015.
38. Українська література XIX століття. Хрестоматія. -Київ, 2006.
39. Українські поети XX століття. - Київ., 2006.
40. Хмяльніцкі М.М. Польская драматургія XX стагоддзя. – Мінск, 2008.
41. Чижевський Д.І. Історія української літератури. - Київ, 2008.

## ЭЛЕКТРОННЫЯ РЭСУРСЫ

Электронная бібліятэка БДУ: **http://elib.bsu.by/**

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

1. Рэферат.
2. Тэст.
3. Вуснае апытанне.
4. Кантрольная праца.
5. Залік.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДА КСР

**1.** Польская літаратура эпохі Ренесансу.
2. Я. Каханоўскі — першы славянскі паэт эпохі Рэнесансу
3. Асноўныя кірункі развіцця польскай прозы ў 2-й палове XX ст.
4. Паэзія 2-й пал. XX ст. В. Шымборска, Э. Ліпска, Ю. Баран, Л. Мачульскі і інш. (па выб.).
**5.** Роля «класікаў» і «шасцідзесятнікаў у абнаўленні украінскага літаратурнага працэсу.

**6.** Пашырэнне палітры вобразна-выяўленчых сродкаў мастацкага пісьма ў к. 80-х – пач. 90-х (на прыкладзе творчасці М. Рыльскага, П. Тычыны, В. Стуса, Л. Кастэнкі і інш.).
**7.** «Аналітычны інтэлект» паэзіі І. Драча.
8. Неарамантыкі ў паэзіі: В. Сіманенка, М. Вінграноўскі ( па выб.).
**9.** Асаблівасці сатыры В. Сіманенкі.Неакласічныя традыцыі ў паэзіі Р. Лубкіўскага.
**10.**Жыццёвы і творчы шлях Алеся Ганчара.Асноўныя этапы жыцця і творчасці Ю. Андруховіча.
**11.**Натуралізм, сюррэалізм і гатычнасць у творчасці В. Мэдвідзя, А. Ульяненкі, А. Жоўны, Ю. Гудзя, А. Ірванца (па выб.).
**12.**Здабыткі украінска-беларускага культурнага і літаратурнага ўзаемадзеяння перыяду дзяржаўнай незалежнасці Украіны і Беларусі.
**13.**Чэслаў Мілаш – польскі паэт, празаік, эсэіст.
**14.**Жыццё і творчасць Віславы Шымборскай.
**15.**Драматургія Славаміра Мрожака.
**16.**«Рытм часу» у паэзіі Эвы Ліпскай, Рафала Воячэка, Юзэфа Барана (па выб.)

**ПРАТАКОЛ**
**УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы по вучэбной дысцыпліне | Решэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя польскай літаратуры | кафедра славянскіх літаратур філалагічнага факультэта | прапаноў няма | змяненняў не патрабуецца пратакол № 9 ад 26.05.2016 |
| Гісторыя украінскай літаратуры | кафедра славянскіх літаратур філалагічнага факультэта | прапаноў няма | змяненняў не патрабуецца пратакол № 9 ад 26.05.2016 |

## ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ
## Ў ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЕ УВА
## НА _________ / _________ ВУЧЭБНЫ ГОД

| №<br>п/п | Дапаўненні і змены | Абгрунтаванне |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
_______________________________ (пратакол № ____ ад __________ 20___ г.)

Загадчык кафедры

_____________________ ___________________ _______________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта

_____________________ ___________________ _______________________